

# ТЭОРЫЯ, МЕТОДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*А. М.ПАЦЫЕНКА*

## МАСТАЦКАЯ ТВОРЧАСЦЬ ПАРТЫЗАН І НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ЧАС ЯЕ АКУПАЦЫІ ФАШЫСТАМІ

Першыя расткі мастацкай творчасці беларускіх партызан з’явіліся ўжо ў 1941 г. Былы партызан, даследчык партызанскай мастацкай творчасці, І.В.Гутараў пісаў: «Спачатку, калі нашы сілы былі невялікімі, мы хаваліся ў лясных зямлянках, глухіх пасёлках, лазнях, хатах леснікоў. Па чарзе круглыя суткі неслі каравульную службу. У населеныя пункты заглядвалі рэдка…Звычайна пасля ўдалай аперацыі мы арганізоўвалі ў вёсцы палітыка-агітацыйную вечарынку з песнямі і ад’язджалі ў свае лясныя станы» [2, с. 30–31].

Амаль у кожным атрадзе былі партызаны, у мінулым звязаныя з мастацтвам: артысты, выкладчыкі музыкі, студэнты мастацка-творчых навучальных устаноў, удзельнікі самадзейных мастацкіх калектываў. Яны звычайна і станавіліся арганізатарамі партызанскай мастацкай самадзейнасці.

Партызаны атрада «Бальшавік» (Гомельская вобласць) далі першы канцэрт для насельніцтва яшчэ ў канцы верасня 1941 г. Пры разгроме фашысцкага гарнізона ў саўгасе імя М. Горкага партызанам у якасці трафея разам са зброяй і прадуктамі дастаўся баян. У атрадзе быў добры баяніст. Пасля мітынгу ў гонар перамогі для насельніцтва быў дадзены імправізаваны канцэрт. На наступны дзень камісар атрада Я.І.Барыкін вырашыў стварыць агітбрыгаду і падрыхтаваць тэматычную праграму. Хутка такая брыгада была створана. Ра- зам з камісарам у яе ўвайшлі шэсць чалавек. Толькі за кастрычнік 1941 г. яна правяла ў вёсках Рэчыцкага раёна шэсць выступленняў [1, с. 85].

У 1942 г. партызанская мастацкая самадзейнасць была створана ў многіх атрадах і злучэннях. Разам са сродкам культурнага адпачынку яна становіцца дзейснай зброяй палітычнай прапаганды. Калектывы самадзейнасці пачынаюць ствараццa па рашэнні падпольных партыйных органаў і партызанскага камандавання для ўзмацнення агітацыйнай работы на акупіраванай тэрыторыі. Агітацыйна-прапагандысцкая накіраванасць мастацкай самадзейнасці патрабавала актыўных, цікавых і дзейсных формаў. І такія формы з’явіліся.

У чэрвені 1942 г. па ініцыятыве Маскоўскага камітэта камсамола з добраахвотнікаў, пажадаўшых змагацца з ворагам у Беларусі, быў створаны Маскоўскі атрад аўтаматчыкаў імя М.Гастэлы. А.Цітову, былому артысту Гомельскага абласнога тэатра, было даручана стварыць з гастэлаўцаў агітацыйна-мастацкую брыгаду, якая выступала ва ўсіх населеных пунктах і партызанскіх атрадах, праз якія праходзілі партызаны [1, с. 85–86].

16 лістапада 1942 г. камандзірам Мінскага партызанскага злучэння Р.Н.Мачульскім быў выдадзены загад, згодна якому стваралася мастацкая агітбрыгада пры Галоўным штабе злучэння ў складзе Вешава, Бушуева, Тамуркіна, Збара, Ручана, Хамка, Бародзіч, Цітова, Шчарбатаў. Мастацкім кіраўніком агітбрыгады быў прызначаны Вешаў Аляксандр Фёдаравіч, палітычным кіраўніком – Шчарбатаў Рыгор Міхайлавіч [8, с. 20].

У ліку першых партызанскіх мастацкіх калектываў быў і ансамбль песні і танца брыгады «Няўлоўныя». Ідэя яго стварэння належала камісару брыгады Б.Л.Глезіну, які да Вялікай Айчыннай вайны працаваў дырэктарам клуба ў г. Магілёве. Пасля некалькіх выступленняў ансамбля аб ім даведалася камандаванне суседніх партызанскіх атрадаў і брыгад. Артысты сталі атрымліваць запрашэнні выступіць у суседзяў. За верасень – кастрычнік 1942 г. удзельнікі ансамбля прайшлі многія дарогі Полацкага, Расонскага, Верхнядзвінскага і Асвейскага раёнаў Віцебскай вобласці. За гэты час было дадзена больш за 100 канцэртаў для партызан і мясцовага насельніцтва. Часам прыходзілася даваць два–тры канцэрты ў дзень [9, с. 127].

Стварэнне партызанскіх мастацкіх калектываў на тэрыторыі Беларусі ў І942–І944 гг. стала паўсюднай з’явай. Партызаны былі не толькі выканаўцамі ў канцэртах, але і аўтарамі твораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асабліва вялікая работа вялася ў сувязі з падрыхтоўкай да савецкіх свят. Напрыклад, перад Лідскім агіттэатрам была пастаўлена задача падрыхтаваць канцэрт да 1 Мая 1944 г. Патрэбна было падабраць неабходны рэпертуар, дастаць музычныя інструменты, падрыхтаваць касцюмы. Для святочнага канцэрта не хапала тэматычных твораў, і ўдзельнікі самадзейнасці самі стваралі канцэртныя нумары. Партызаны раздабылі два акардыёны, скрыпку і іншыя музычныя інструменты, нямецкае абмун- дзіраванне. Для танцавальнай групы былі пашыты беларускія нацыянальныя касцюмы і матроскі, у якіх партызанскія артысты выконвалі танцы «Лявоніху» і «Яблычак». Мундзір для артыста, які выконваў ролю Мусаліні, пашылі з брызенту, начапіўшы на яго нямецкія пагоны і ўзнагароды. Для іншых касцюмаў фарбавалі белы парашутны матэрыял адварам шалупіння цыбулі і карой з дрэў у розныя колеры.

Праграма выступлення складалася з трох аддзяленняў. У першым выконваліся песні, танцы, вершы, частушкі, у другім – паказвалася п'еса Г.Ананьевай «Германскі блок», трэцяе аддзяленне прысвячалася партызанскай барацьбе. Заканчвалася выступленне акрабатычным эцюдам.

У гады Вялікай Айчыннай вайны з'явіўся зусім новы від мастацкага калектыву – агітацыйна-мастацкі атрад. Такі атрад быў створаны ў пачатку 1944 г. у Вілейскай вобласці. Створанаму агітатраду далі імя М.Горкага. Камандзірам яго быў прызначаны капітан У.Ціханаў, мастацкім кіраўніком – А.Мікалаеў, начальнікам штаба – Ф.Ягадзінскі. Усе трое ў даваенны час былі актыўнымі ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці. Камандаванне брыгад і атрадаў забяспечыла сваіх артыстаў зброяй і музычнымі інструментамі. У яго былі залічаны і лепшыя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці з мясцовых жыхароў партызанскай зоны.

Агітатрад з'яўляўся самастойнай партызанскай адзінкай. Ён складаўся з трох падраздзяленняў: ансамбля песні і танца, баявога і гаспадарчага ўзводаў, меў свой штаб. У ансамбль уваходзілі агітатары, хор, аркестр, танцавальная і вакальная групы. Удзельнікі ансамбля вывучалі нотную грамату, падбіралі і складалі рэпертуар, праводзілі рэпетыцыі. Яны рэгулярна займаліся страявой і фізічнай падрыхтоўкай, неслі каравульную службу.

За перыяд сваёй дзейнасці агітатрад даў 150 канцэртаў, на якіх пабывалі 80 тысяч чалавек. Трэба адзначыць, што ён быў самым вялікім калектывам партызанскай мастацкай самадзейнасці. Яго склад даходзіў да 70 чалавек [7, с. 320]. Пасля вызвалення Беларусі калектыў быў рэарганізаваны ў прафесійны калектыў – Маладзечанскі абласны ансамбль песні і танца.

Часам гурткі мастацкай самадзейнасці ствараліся сумеснымі намаганнямі партызан і мясцовага насельніцтва. У канцы 1942 г. партызанская брыгада імя Варашылава (Віцебская вобласць) вызваліла ад фашыстаў вёску Гомель Полацкага раёна. Моладзь вёскі звярнулася да камандавання брыгады з просьбай даць сумесны з партызанамі канцэрт для жыхароў сяла. Першы канцэрт, арганізаваны партызанамі і моладдзю Гомеля, стаў днём нараджэння ансамбля партызанскай самадзейнасці. Кіраўніком ансамбля быў прызначаны былы дырэктар Ветрынскага раённага Дома культуры Ігнат Плясько.

У Лагойскім раёне ў вёсцы Карпілаўка ў гады вайны размяшчалася партызанская брыгада «Штурмавая». Сельская моладзь і партызаны збіраліся вечарамі ў каго-небудзь дома, спявалі песні, частушкі, танцавалі, чыталі вершы. На гэта звярнула ўвагу настаўніца М.А. Васілевіч, якая захаплялася тэатрам. Яна напісала п'есу «Шпіён» і прапанавала моладзі ажыццявіць яе пастаноўку. Быў створаны драматычны гурток, пачаліся рэпетыцыі. На прэм'еру спектакля сабралася столькі гледачоў, што памяшканне аказалася перапоўненым, і многім давялося глядзець праз адчыненыя вокны.

У некаторых атрадах і брыгадах ствараліся самадзейныя партызанскія аркестры. Іх склад у многім залежаў ад наяўнасці музычных інструментаў, якія ўдавалася раздабыць у час баёў з немцамі. Аркестр народных інструментаў быў і ў агітацыйна-мастацкім атрадзе імя М.Горкага. Тут былі баяны, цымбалы, скрыпкі, мандаліны, балалайкі і бубны. Партызанскі атрад імя М. Фрунзе (Мінская вобласць) пры разгроме аднаго з варожых гарнізонаў у якасці трафея захапіў камплект музычных інструментаў духавога аркестра. Сярод партызан знайшліся музыканты і стварылі духавы аркестр. Своеасаблівы шумавы аркестр быў створаны ў 208 партызанскім палку (Магілёўская вобласць). Яго ўдзельнікі ігралі на баяне, губных гармоніках і грабянцах. Ударнымі інструментамі былі шэсць бутэлек рознай велічыні і гучання, некалькі бляшанак і драўляныя цуркі з цвёрдых парод дрэва. Самадзейныя аркестры былі ў партызанскіх брыгадах В.Гіль-Радыёнава, І.Шлапакова і інш.

Больш за ўсё партызанскія мастацкія калектывы ствараліся ў цэнтральных і ўсходніх раёнах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі. Шырокую вядомасць атрымалі калектывы сама- дзейнасці 1-й, 2-й і 3-й мінскіх партызанскіх брыгад, брыгад «Полымя», «Разгром», імя газеты «Праўда», імя А.Суворава, імя В.Чапаева, імя С.Будзённага, 12-й кавалерыйскай брыгады імя І.Сталіна ў Мінскай вобласці; 1-й Бабруйскай брыгады і многія іншыя. У заходніх абласцях рэспублікі, дзе савецкая ўлада ўсталявалася толькі перад вайной, мастацкіх калектываў было менш.

У многіх партызанскіх атрадах і злучэннях, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі, існавала самадзейнасць «мясцовага значэння», удзельнікі якой не выязджалі ў суседнія брыгады, а выступалі толькі перад сваімі сябрамі. Яны таксама служылі галоўнай мэце – выхаванню партызан, іх мабілізацыі на выкананне пастаўленых баявых задач. Такіх калектываў было даволі шмат. «Калі мець на ўвазе такую мастацкую самадзейнасць, – адзначаў прафесар А.І.Залескі, – то можна смела сказаць, што яна існавала ў кожнай партызанскай брыгадзе, у кожным атрадзе» [3, с. 305].

У сваіх мемуарах былы мастацкі кіраўнік Лідскага агіттэатра заслужаны работнік культуры Беларускай ССР М.І.Шчансновіч пісаў: «Успамінаеш зараз нашы паходы і проста не верыцца, як мы гэта вытрымалі. Уявіце сабе пераход у 20–30 кіламетраў па цяжкіх партызанскіх дарогах, праз балоты, кароткі адпачынак, а дакладней – падрыхтоўку да спектакля, які працягваўся ад дзвюх з паловай да трох гадзін, абед, потым зноў пераход ці пераезд і другі спектакль у той жа дзень. Пасля спектакля ўсе танцавалі, не для асабістага задавальнення, а каб людзі, да якіх мы прыехалі, маглі адпачыць у поўную меру ... А ў вольныя ад выездаў дні нашы артысты прымалі непасрэдны ўдзел у баявых аперацыях» [10, с. 130].

Своеасабліва ішло размеркаванне роляў у спектаклях. Многія партызанскія артысты не хацелі выконваць ролі фашыстаў і даводзілася прыбягаць да жараб'ёўкі. Звычайна выканаўцаў гэтых роляў апраналі ў камічныя касцюмы. Тыя, хто выконваў ролю нямецкіх вартавых, выходзілі на сцэну ў вялізных саламяных лапцях, а на галовах у іх былі жаночыя хусткі. Іх з'яўленне сустракалася свістам, вострымі словамі, улюлюканнем.

У населеныя пункты, дзе выступалі партызаны, па даносу фашысцкіх шпіёнаў часта накіроўваліся ўзмоцненыя нарады немцаў і паліцаяў. Аднак самадзейныя артысты своечасова знікалі, а карацелі траплялі пад агонь партызан. Населеныя пункты, у якіх арганізоўваліся канцэрты, надзейна ахоўваліся партызанамі, ды і самі артысты ўмелі не толькі спяваць і танцаваць.

Мастацкая самадзейнасць народных мсціўцаў Беларусі мела інтэрнацыянальны характар. У партызанскіх мастацкіх калектывах былі людзі розных нацыянальнасцей Савецкага Саюза. Напрыклад, толькі ў агітацыйна-мастацкім атрадзе імя М.Горкага ўдзельнічалі прадстаўнікі шасці нацыянальнасцей: беларусы, грузіны, палякі, рускія, украінцы і яўрэі. У шэрагу выпадкаў арганізоўваліся своеасаблівыя абменныя канцэрты. Перад партызанамі і насельніцтвам паўднёва–ўсходніх раёнаў Беларусі выступалі мастацкія калектывы ўкраінскіх партызан са злучэнняў С.А.Каўпака, А.Ф.Фёдарава і П.П.Вяршыгары. Часам рабіліся сумесныя вечары самадзейнасці беларускіх партызан з украінскімі. Такія выступленні садзейнічалі выхаванню інтэрнацыяналізму, брацкай узаемадапамогі, умацоўвалі дружбу суседніх народаў.

Як правіла, выступленні партызанскай мастацкай самадзейнасці ажыццяўляліся ў комплексе з вуснай прапагандай і агітацыяй. Удзельнікі агітатрада імя М.Горкага вазілі з сабой плакаты і карыкатуры, у якіх высмейвалі фашыстаў і іх памагатых. З іх перад канцэртам рабілі выставу. Такое комплекснае спалучэнне вуснай прапаганды, нагляднай агітацыі і мастацкай самадзейнасці садзейнічала эфектыўнаму і эмацыянальнаму ўздзеянню на партызан і насельніцтва.

Выступленні партызанскіх артыстаў вызначаліся даходлівасцю і даступнасцю. Падзеі, што адбываліся на сцэне, былі блізкімі і зразумелымі савецкім людзям, якія знаходзіліся на акупіраванай тэрыторыі, аказвалі на іх вялікі ўплыў. «Эмацыянальнае ўздзеянне на аўдыторыю амаль кожнага нумара было вельмі моцным, – успамінае былы мастацкі кіраўнік Лідскага агіттэатра М.І.Шчансновіч. – Як толькі ў "Лявонісе" паяўляліся на сцэне дзяўчаты ў нацыянальных касцюмах з вянкамі на галаве, твары гледачоў адразу расцвіталі радаснымі ўсмешкамі. Калі Ганна Маркаўна Тайц пачала чытаць верш "Голас з палону", ён выклікаў слёзы ў тых, чые родныя былі вывезены на катаргу ў Германію…» [11, с. 170].

Удзельнікі самадзейнасці мастацкімі сродкамі паказвалі зверствы акупантаў на савецкай зямлі, расказвалі аб жахах нямецкай катаргі, аб планах фашыстаў, угатаваных савецкаму народу, аб гераічных подзвігах чырвонаармейцаў і партызан, заклікалі да бязлітаснай барацьбы з фашысцкімі прыгнятальнікамі. Такія канцэрты актывізоўвалі народных мсціўцаў на барацьбу з захопнікамі. Аб рэакцыі гледачоў на канцэртах мастацкай самадзейнасці ўспамінае былы сакратар Рагачоўскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падпольнага райкама партыі І.Ц.Зуевіч: «Глядзіш, бывала, на гэтых змораных, дрэнна апранутых, часта галодных людзей і здаецца, што забыліся яны пра ўсё на свеце. Але прыгледзішся, не, не забываюць галоўнага – барацьбы: усе са зброяй, у поўнай гатоўнасці да дзеяння» [4, с. 217].

Даведаўшыся аб тым, што адбудзецца канцэрт партызанскай мастацкай самадзейнасці, на яго прыходзілі звычайна ўсе жыхары не толькі вёскі, дзе адбываўся канцэрт, але і суседніх населеных пунктаў. А насельніцтва аддаленых вёсак прысылала да партызанскага камандавання сваіх прадстаўнікоў з просьбай выступіць з канцэртамі і ў іх. В.І.Лівенцаў успамінае, што, «даведаўшыся аб канцэрце, які адбыўся ў вёсцы Пагарэлае, жыхары рабочага пасёлка Градзянка прыслалі да нас сваіх дэлегатаў з просьбай правесці сход ў іх, пазнаёміць з падзеямі на франтах і паказаць мастацкую самадзейнасць. Брыгада выехала. Вялікае памяшканне сярэдняй школы было набіта людзьмі. Партызанам з цяжкасцю ўдалося прабрацца да імправізаванай сцэны…

Пасля канцэрта жыхары доўга не хацелі разыходзіцца. Вайна для іх нібыта адышла, і зноў на тварах людзей паявіліся ўсмешкі, смех, сыпаліся жарты» [6, с. 315]. Падобныя вечары ў спалучэнні з мастацкай самадзейнасцю 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады былі праведзены ў вёсках Лазавое, Макаўе, Осава, Амінавічы, Каменічы і іншых населеных пунктах.

Насельніцтва рэспублікі горача дзякавала ўдзельнікам партызанскай мастацкай самадзейнасці за дастаўленую радасць. Іх частавалі, давалі адзенне, абутак, зброю. Так, агітбрыгада партызанскага атрада Перасценка ў адной з вёсак Клічаўскага раёна атрымала ў падарунак чатыры кулямёты, 19 вінтовак, мінамёт і аўтамат, падабраныя жыхарамі на месцах былых баёў [8, с. 23].

У рэдкія хвіліны адпачынку партызаны любілі слухаць музыку. Яна дапамагала ім пераносіць цяжкасці партызанскага жыцця, абуджала ўспаміны аб даваеннай пары, згладжвала іх суровы быт, натхняла на баявыя подзвігі. У вёсцы Глыбокі Брод Бялыніцкага раёна (Магілёўская вобласць) у гады вайны жыў адзінокі дзед А.А.Шпакоўскі, які добра іграў на цымбалах. Дзедава хата стала своеасаблівым клубам для партызан з суседніх атрадаў. Партызанскія групы, накіроўваючыся на заданні ці вяртаючыся ў атрады, не праходзілі міма «клуба». Вечарамі вокны хаты з боку дарогі завешвалі плашч-палаткамі, на прыпечку запальвалі лучыну. Хата запаўнялася партызанамі, якія з вялікай асалодай слухалі любімыя мелодыі ў выкананні Апалінарыя Антонавіча.

Адзначаючы ролю мастацтва ў патрыятычным выхаванні воінаў Чырвонай Арміі, двойчы Герой Савецкага Саюза Маршал Савецкага Саюза В.І.Чуйкоў пісаў: «...Нельга не ўспомніць добрым словам чырвонаармейскую мастацкую самадзейнасць. Яе маральна-палітычнае значэнне цяжка пераацаніць. Можна смела сказаць, што яна іншы раз мела і прамое ваеннае значэнне. Калі немцы чулі музыку ці рускую песню, гэта наўрад весяліла іх – яны гублялі апошнія астаткі ўпэўненасці ў перамозе. Разам з тым песня ўзнімала дух нашых воінаў» [5, с. 119].

Не менш важнае значэнне адыгрывала і ў тыле ворага партызанская мастацкая самадзейнасць. Даведаўшыся аб «гастролях» ансамбля песні і танца партызанскай брыгады «Няўлоўныя» па раёнах Віцебскай вобласці, акупанты праявілі незадавальненне, аднак знішчыць партызанскіх артыстаў не маглі. «Партызаны над намі здзекваюцца!» – лютаваў ваенны камендант горада Полацка. А нямецкі антыфашыст Карл Мюлер перадаў праз сувязных камандаванню брыгады цікавае прызнанне аднаго з афіцэраў гарнізона ў Полацку ў сувязі з выступленнем партызанскага ансамбля: «Не разумею гэтых рускіх. У іх літаральна пятля на шыі, а яны спяваюць і танцуюць. Што гэта за людзі?» [9, с. 162].

Цяжка было фашыстам зразумець савецкіх людзей, якія, не шкадуючы жыцця, змагаліся за незалежнасць сваёй Радзімы. Гэтыя партызанскія канцэрты былі не проста песнямі і танцамі, а грознай ідэалагічнай зброяй, якая станавілася часам не менш эфектыўнай, чым вінтоўка ці аўтамат. І той факт, што з 28 чалавек у лютым 1942 г. у брыгадзе «Няўлоўныя» да 1944 г. стала 3000 партызан, сведчыць аб тым, што вялікая заслуга ў росце партызанскіх сіл належала і партызанскай мастацкай самадзейнасці.

Такім чынам, партызанская мастацкая творчасць садзейнічала выхаванню патрыятызму і гераізму народных мсціўцаў і насельніцтва Беларусі. Ва ўмовах акупацыі мастацкая творчасць партызан з'яўлялася ідэйнай зброяй у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, была падпарадкавана агульным задачам разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў, служыла яднанню партызан і насельніцтва рэспублікі, узнімала баявы дух народных мсціўцаў.

1. *Беларускае* мастацтва: Зб арт. і матэрыялаў / Рэдкал.: П.Ф.Глебка і інш. – Мн.: Выд-ва АН БССР, 1960. – Вып. 2.

2. *Гуторов И.В.* Борьба и творчество народных мстителей. – Мн.: Госиздат БССР, 1949.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. *Залесский А.И.* В партизанских краях и зонах. – М.: Соцэкгиз, 1962.
4. *Зуевич И.Т.* Райком в подполье. – Мн.: Беларусь, 1972.
5. *Когда* пушки гремели. 1941–1945 / Под общей ред. П.С.Дариенко. – 2-е изд., доп. – М.: Искусство, 1978.
6. *Ливенцев В.И.* Партизанский край. – Мн.: Беларусь, 1969.
7. *Люди* нарочанского края: Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. – Мн.: Беларусь, 1975.
8. *Пациенко А.М.* Культурно-просветительная работа в партизанских краях и зонах Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1944 гг.): Текст лекции / Минский пединститут им. А. М. Горького. – Мн., 1981.
9. *Прудников М.С.* Неуловимые. – М.: Воениздат, 1961.
10. *Сченснович Н.И.* Записки актёра и партизана. – Мн.: Беларусь, 1976.
11. *Сченснович Н.И.* Пущанские премьеры // Неман. – 1970. – № 5. – С. 159–176.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ